змястоўныя ў кнізе групавыя сцэны («На Чорных лядах», «Народныя мсціўцы», «Перад канцом», «Жоўты пясочак»), дзе праз бытавыя дэталі, рэплікі дыялогаў, аўтарскія рэмаркі раскрываюцца складаныя характары, чыніцца драматычнае дзеянне. І яшчэ. У зборніку «Сьцяна» В.Быкаў асабліва лапідарны паводле стылістыкі, удумліва-стрыманы, нават крыху рацыянальны. Відаць, гэта вызначаецца змястоўнымі асаблівасцямі твораў Што ж, не толькі пісьменнік шукае, выбірае свой матэрыял, але і сам матэрыял дыктуе аўтару спосаб мастацкага увасаблення, патрабуе адпаведнай інтанацыі, таго ладу душы, які найлепш выкажа праўду жыцця.

## Знайсці сябе сярод сваіх людзей

Творчасць Аляксея Карпюка, вядомага беларускага празаіка, нашага земляка, добра знаёмая прыхільнікам літаратуры. Яго аповесці «У адным інстытуце», «Данута», «Дзяўчына з Ваўкавыска», «Пушчанская адысея», «Вершапінскі рай», шматлікія апавяданні асабліва блізкія чытачам нашага рэгіёну: дзеянне ў творах часцей разгортваецца на Гродзеншчыне, адлюстроўваюцца факты, падзеі, цесна звязаныя з прынёманскім краем. З цікавасцю сустрэта і кніга «Свежая рыба», выпушчаная ў 1978 годзе ў выдавецтве «Мастацкая літаратура».

У творчасці А.Карпюка — моцная народна-маральная аснова. Маральна-прававыя нормы беларускай народнай культуры сталіся для пісьменніка своеасаблівым камертонам успрымання з'яў і падзей. Яго станоўчыя героі — носьбіты традыцыйна сфармаваных уяўленняў пра справядлівасць і чалавечнасць.

Вельмі адметная творчая манера празаіка. Чытаеш кнігу і не заўважаеш у ёй устойлівых прыёмаў мастацкага пісьма, сродкаў вобразнай умоўнасці, быццам праходзіць перад табою жывое, рэальнае жыццё з яго звычайнымі чалавечымі адносінамі. Форма апавядання ў А.Карпюка размоўна вольная, не звязаная строг імі сюжэтнымі законамі. Часцей гэта непадробны ў сваёй натуральнасці аповед ад першай асобы — апавядальнік бачыць у нас даверлівага суразмоўцу, уважлівага, як і ён сам, да звычайных, знешне не эфектных з'яў і падрабязнасцяў жыцця. Аднак такое раскаванае, «нелітаратурнае» выкладанне матэрыялу і ёсць літаратурна-эстэтычны прыём, які стварае ў чытача ілюзію поўнай рэальнасці таго, што паказваецца. Тым больш, што факты, зафіксаваныя аўтарам, бяруцца з будзённых, побытавых пластоў жыцця. І характэрна, што гэтыя факты пісьменнік нечакана паварочвае да нас такой гранню, якая

высвятляе іх глыбінны маральна-філасофскі сэнс. Так будзённая сітуацыя, пададзеная дакладна, рэалістычна канкрэтна, становіцца з'явай мастацтва і нясе эстэтычнае адкрыццё.

Аповесць «Свежая рыба», якой адкрываецца кніга, і вызначаецца такой знешняй немудрагелістасцю зместу. Муж і жонка — сучасная гарадская інтэлігенцыя — жывуць звычайнымі сямейнымі і службовымі клопатамі, у іх раскрываюцца характары. Ён, цалкам уключаны ў любімую творчую працу, здаецца ёй часам рацыянальна аднабаковым і эгаістычным. Яна, натура адухоўленая, паэтычная, сустракае кожную працоўную раніцу на вуліцы незнаёмага чалавека і ўяўляе яго асобай незвычайнага душэўнага складу. Знешняя абаяльнасць і карэктнасць таямнічага сустрэчнага напаўняецца ў яе ўспрыманні ўсё больш узвышанымі якасцямі. Калі ж нарэшце асмельваецца загаварыць з ім, ён спяшаецца паведаміць, што паступіла ў продаж свежая рыба і раіць хутчэй заняць чаргу ў краме. Гэта канцоўка твора, і яна стварае нечаканы эстэтычны ракурс, які дазваляе па-іншаму зірнуць на ўсе ранейшыя дзеянні і ўяўленні герояў. Пісьменнік супрацьстаўляе сапраўдныя і ўяўныя каштоўнасці і прымушае нас задумацца над складанасцю жыцця, над сапраўднай духоўнасцю чалавека, якая робіць яго асобаю. Увогуле ў кнізе аўтар праяўляе асаблівую цікавасць да нелагічных, знешне парадаксальных учынкаў людзей, адкрываючы ўнутраную, маральную логіку іх паводзін. Гэта добра відаць у кароткіх апавяданнях-замалёўках, што ўвасабляюць лакальныя сцэнкі, проста выпадкі з жыцця, добра падгледжаныя аўтарам. У такіх накідах з натуры пісьменнік звычайна ўхіляецца ад уласных вывадаў, пакідаючы нам магчымасць адказваць на многія цяжкія пытанні, якія штодзённа ставіць перад намі навакольная рэчаіснасць. Але аўтар не пабочны назіральнік. Заўсёды адчуваецца яго грамадзянска-эстэтычная пазіцыя, яго вернасць народным маральным законам жыцця. Мы бачым жыццё вачыма пісьменніка, які дапамагае нам шукаць сваю сцяжыну, сваё месца сярод людзей.

Апавяданні-мініяцюры ў гэтай кнізе цікавыя не знешняй займальнасцю, а маральнай змястоўнасцю. У іх ёсць значная аўтарская думка пра духоўныя каштоўнасці чалавечага жыцця («Выпадак з хлопчыкам», «На паветранай трасе», «Какетка», «У вагоне», «Кульгавая»), пра ўнутраныя набыткі і страты людзей нашага імклівага часу («Прачнуўся», «Пярсцёнак», «Мне не дакладвае», «Пстрычка»), пра вайну і фашызм, пра сілу народнага духу («Пагашаныя яблыні», «Патрон», «Пасыльны», «Сіла песні»). Сацыяльнай завостранасцю думкі вылучаюцца замалёўкі сатырычнага характару

(«Урок з нагляднасцю», «Чорны кот», «Класік»), Сур'ёзнай мастацкай задачы служыць і гумарыстычная ўсмешка аўтара («Простае пытанне», «Удзячнасць»),

Да мініапавяданняў прымыкаюць у кнізе дзённікавыя запісы пісьменніка пра сустрэчы з замежнымі турыстамі. Хоць аўтар вядзе тут размову ў інфармацыйным стылі, карыстаючыся прыёмам публіцыстычнага рэпартажу, ён перадае не столькі знешнія ўражанні пра людзей іншых краін, колькі роздумы пра іх унутраны свет, пра тое, што збліжае і што раз'ядноўвае народы. Тут той жа пошук, што суправаджаецца сумненнямі, расчараваннямі, знаходкамі прыгожага ў чалавеку. Калі ўлічыць, што ў кнігу А.Карпюка ўвайшлі і сюжэтна разгорнутыя апавяданні («Пераможца», «Акупацыя»), то зборнік выглядае даволі разнастайным у жанравых адносінах. Але гэта не парушае яго мастацкага адзінства, абумоўленага адзінствам аўтарскай манеры пісьма. Пісьменнік застаецца паслядоўным у перадачы свайго светаўспрымання, натуральным і непасрэдным у сваім кантакце з чытачом-суразмоўцам (пэўная літаратурна-эстэтычная поза заўважаецца, праўда, у замалёўцы «Гімн прыгажуні» і інш.).

Цэнтральнае месца ў кнізе займае аповесць «Па кветку шчасця». Напісаная ў форме непаспешлівай біяграфічнай хронікі, яна ўмяшчае, па сутнасці, шырокую панараму народнага жыцця Заходняй Беларусі працяглага гістарычнага часу. З вышыні сучаснага жыццёвага, ідэйна-маральнага вопыту пісьменнік разглядае мінулае, узіраючыся ў яго глыбока і зацікаўлена, дапамагаючы нам такім чынам лепш зразумець сённяшнюю рэальнасць. Многія ісціны грамадска-вызваленчага руху міжваеннага часу, маральных пастулатаў тагачаснай вёскі, юнацкіх імкненняў сваёго пакалення аўтар пераацэньвае, кіруючыся прынцыпамі высокай чалавечнасці, гістарычнай аб'ектыўнасці. Але гэта цяжкія пераацэнкі, бо за імі — горыч стратаў і агульначалавечага, і сацыяльнага характару. Ноты смутку і душэўнага болю спалучаюцца ў творы са светлым адчуваннем жыцця. Рух галоўнага героя аповесці, за якім мы добра бачым аўтара, паказваецца як працэс духоўнага росту, грамадзянскага гартавання ў суровых выпрабаваннях часу. Але аўтар далёкі ад бяздумнага аптымізму, ён маральна патрабавальны да свайго героя, часам нават жорсткі. Пра гэта вельмі красамоўна гаворыць эпілог, дзе падвядзенне вынікаў драматычнае і па-народнаму мудрае.

Аповесць «Пра кветку шчасця» нясе ў сабе багаты пазнавальны матэрыял грамадска-гістарычнага, побытавага зместу. Тут адлюстраваны рэальныя факты, падзеі, людзі. І хаця можна заўважыць у творы пэўныя выдаткі хранікальнасці (не ўсюды апраўданая дэта-

лізацыя, кампазіцыйная расслабленасць), гэта з'ява значнага мастацкага зместу.

Кніга А.Карпюка «Свежая рыба» сведчыць пра вялікі творчы патэнцыял пісьменніка, які па-мастацку паспяхова засвойваў маршруты жыцця нашага краю, беларуска-польскага памежжа. Пісьменнік імкнуўся ідэнтыфікаваць перш за ўсё ўласнае «я» ў кантэксце народнага жыцця, яго сацыяльна-грамадскіх працэсаў. За гэтым «я» — вялікая грамада моладзі Заходняй Беларусі, якой суджана было стаць абаронцам яе гонару, яе народнага сумлення.

## Падрахункі, развітанні

З асаблівым пачуццём бярэш у рукі кніжку, якая стала для аўтара апошняю, у якую ён уклаў часціну сябе, свайго сэрца, але патрымаць у руках дарагое тварэнне не паспеў. Што ўжо казаць пра кнігу такога знанага паэта, як Максім Танк, які прайшоў немалую і няпростую дарогу і вершы для апошняга зборніка пісаў у цяжкім прадчуванні, што яна хутка абарвецца. Пра што ён думаў і што адчуваў тады, калі ўзіраўся ў далячынь з акна бальнічнай палаты ці ўласнай кватэры, адзінокі ўжо і нямоглы? Як глядзеў на свет цяпер, ва ўмовах нашага бязладдзя гэты аўтарытэтны грамадскі дзеяч і паэт, шмат у чым расчараваны, але пры гэтым усё ж перакананы ў слушнасці ідэалаў сваёй баявой маладосці?

У кнізе змешчаны самыя апошнія яго вершы — 1993-1994-х гадоў. Назва «Errata» — выяўленыя памылкі — выразна гаворыць пра жаданне азірнуцца і перагледзець пройдзенае. Нечаканага ў гэтым няма. Імкненне да крытычных самаацэнак натуральнае для чалавека, які шмат зведаў у жыцці. Праўда, варта ўдакладніць: на гэта здольныя натуры мужныя і высакародныя, які зберагліі ў сабе голас чалавечнасці, натуры глыбока народнага складу. Такім быў Максім Танк.

Народныя маральна-этычныя законы жыцця беларуса — у аснове яго творчасці. Эстэтыка паэта дыктавала яму пошук прыгожага ў самых звычайных праявах роднай рэчаіснасці. Менавіта з прозы жыцця вынікала яго паэзія «Я яе знаходзіў, — пісаў М.Танк у «Лістках календара», — і ў турэмнай адзіночцы, дзе былі толькі голыя сцены». Не выпадкова ў творах даваеннаэўскае пары моцна ядналіся рэалістычна-бытавыя і рамантычна-ўзвышаныя ўласцівасці. У паваенныя дзесяцігоддзі рамантычны пачатак паступова становіцца ўнутранай, глыбіннай якасцю твораў. І М.Танк развіваецца як мастак лірычных рэфлексій пра «дарогу, закалыханую жытам», «смаленне кабана», «капанне бульбы ў дождж», пра глыток калодзежнай вады, хлеб, сосны,